

*А.Астаповіч. Драпежнік. 1920-я гг.*



*Г.Асташонак. Нож кельцкі. 2008.*

А.Чэхава), Луіза («Каварства і каханне» Ф.Шылера), Мірандаліна («Гаспадыня гасцініцы» К.Гальдоні) і інш.

**АСТА́ПЕНКА** Змітрок (Дзмітрый Емяльянавіч; 10.11.1910, в. Калеснікі Смаленскай вобл., Расія — 7.10.1944), беларускі паэт, перакладчык. Скончыў Мсціслаўскі пед. тэхнікум (1929). Працаваў у рэдакцыях рэсп. газет і часопісаў. У 1936 арыштаваны і асуджаны да 8 гадоў пазбаўлення волі. У Вял. Айч. вайну на фронце. Загінуў у Карпатах. Аўтар зб-каў паэзіі «На ўсход сонца», «Краіне» (абодва 1931), «Абураныя» (1932), паэмы «Эдэм» (1944). Пісаў для дзяцей: кніжка-малюнак «Трактар» (1933). Аўтар навук.-фантаст. рамана «Вызваленне сіл» (1932). Перакладаў з рус. мовы.

*Тв.*: Выбранае. Мінск, 1957; Вершы і паэмы. Мінск, 1968.

*Літ.*: Шушкевіч С. Лёс паэта // Шушкевіч С. Выбр. тв. Мінск, 1978. Т. 2; Скрыган Я. Рэквіем // Скрыган Я. Некалькі хвілін чужога жыцця. Мінск, 1990; Маракоў Л. Шасцёра на фотаздымку // Роднае слова. 1999. №6; Камейша К. Змітрок Астапенка // Полымя. 2005. № 2. *І.М.Гоўдзіч.*

**АСТАПО́ВІЧ** Аркадзь Антонавіч (30.9.1896, Мінск — 21.9.1941), беларускі графік. Вучыўся ў Рысавальнай школе Т-ва заахвочвання мастацтваў у Петраградзе (1914—16). У 1921—22 наведваў рысавальныя класы ў Харкаве. З 1929 у Мінску. Працаваў у жанры лірычнага пейзажа ў тэхніках акварэлі і тушы: «Зімовы надвячорак» і «Дворык» (абодва 1921), «Сакавік» (1923), «Вёска. Калодзеж» (1925), «У заапарку» (1926), «Да вясны (насустрач вясне)» (1940). Аўтар цыкла лінарытаў: «Зіма», «Вясковая вуліца», «Млын», «Царква», «Драпежнік», «Вясковыя могілкі» (усе 1920-я гг.). Афармляў кнігі і часопісы. На радзіме бацькоў у в. Навасёлкі Пухавіцкага р-на на будынку школы, у якой ён выкладаў, устаноўлена памятная дошка.

*Літ.*: Аркадзь Антонавіч Астаповіч, 1896—1941. Зінаіда Антонаўна Астаповіч-Бачарова, 1898—1993: кат. выстаўкі. Мінск, 1996. *Н.М.Усава.*

**АСТА́ТАК**, тып вуглавога злучэння сцен зрубнай канструкцыі, пры якім круглыя ці брусковыя бярвёны сумежных сцен з рытмічным чаргаваннем насцілаюцца адзін на адзін такім чынам, што іх канцы выходзяць па-за межы аб'ёму пабудовы. Шырока выкарыстоўваўся ў бел. нар. дойлідстве 19—пач. 20 ст. пры будаўніцтве жылля, клецяў, свірнаў, корчмаў, культавых пабудоў. Вылучаюцца рэгіянальныя адрозненні злучэння сцен з А. У Паазер'і і цэнтр. Беларусі быў пашыраны вугал з 6- або 8-граннай апрацоўкай А. — «у ахрапку». На Палессі прымянялі і вуглавое злучэнне сцен з фігурнай апрацоўкай А. — «на каню».

*Літ.*: Лакотка А.І. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. Мінск, 1999. *Ю.Ю.Захарына.*

**АСТАФ'ЕЎ** Рыгор, беларускі збройнік 17 ст. Родам з Оршы. Быў вучнем у быхаўскага збройніка-пішчальніка Васіля (у 1658). Разам з ім у час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 вывезены ў Маскву. Жыў у Броннай слабадзе сярод бел. пасяленцаў-рамеснікаў. У 1677 А. з Амелькам Сяргеевым зрабіў 4, у 1678 — 10 пішчалей.

**АСТА́Ф'ЕЎ** Сценька, беларускі ювелір 17 ст., «майстар сярэбранай справы». Жыў у Полацку. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 разам з вучнем Антошкам Шчасным, пляменнікам Івашкам і інш. полацкімі рамеснікамі вывезены ў Маскву. Працаваў у Аружэйнай палаце Маскоўскага Крамля.

**АСТА́ШКАВІЧЫ**, вёска ў Светлагорскім р-не. За 22 км на ПдЗ ад г. Светлагорск, 6 км ад чыг. ст. Астанкавічы на лініі Жлобін—Калінкавічы, 132 км ад Гомеля. Цэнтр Асташкавіцкага с/с. 237 гаспадарак, 421 ж. (2009).

Вядомы з 19 ст. як сяленне ў Карпавіцкай воласці Рэчыцкага павета Мінскай губ. У 1858 — 62 двары, 507 ж. У 1885 — 621, у 1897 — 951 ж.,